*Аркадзь Бабко*

## Дзесьці далёка ў лясным гушчары
### (паводле Г. А. Бекера)

Дзесьці далёка, у лясным гушчары,
Ці бачыш ты, як у змроку
Штосьці мільгае, штосьці гарыць?
Напэўна, зорка.
Нас вабіць, хвалюе, нас кліча святло,
І, апантаныя мэтай,
Мы прадзіраемся праз галлё,
Ці не лямпа гэта?
І вось закончаны хуткі бег,
Ён вёў нас да ломкай палічкі,
Да расчаравання – праз слёзы і смех
Мы бачым тут ... толькі газнічку.

## Аднойчы жыў стары кароль
### (паводле Г. Гейнэ)

Аднойчы жыў стары кароль,
З сівою галавою,
У цяжкім сэрцы чуў ён боль,
А шлюб узяў з маладою.
За каралевай юны паж,
Гаворка так галосіць,
(Невыпадковы той пасаж!)
Сукенкі шлейф падносіў.
Вядомы песенькі матыў,
Вясёлы ён і сумны,
Кахання першага парыў
Быў надта легкадумны?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Анёлы
## (паводле Г. Гейнэ)

Нібы той Тамаш бязверны,
У неба верыць не хачу,
Але ведаю напэўна –
Бо сам бачыў іх і чуў, –
Што на свеце ёсць анёлы,
Не ў аблоках – на Зямлі,
І, шаноўныя панове,
Тут яны заўжды жылі.
Прамяністыя істоты,
Зорным позіркам вачэй,
Беласнежных рук пяшчотай,
Ахінаюць нас хутчэй,
І ратуюць ад нядолі,
Дораць радасць і спакой,
Ласкай іх, святой патоляй,
Светлай любасцю жывой,
Кожны быў зачараваны,
І ўсцешаны не раз,
А найперш – той, хто абраны,
Хто паэта сярод нас.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ